


## У НУМАРЫ


| Навіны | Навуковая праца |
|---|---|
| Выстава “Акварэльныя вобразы Мікалая Мішчанкі” | Заслаўе ў беларускай культуры |
| Прывітанне ад калегі | Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст. Пасляслоўе |
| З павагай да зробленага | О первом директоре Заславской средней школы |


## Навіны

### Выстава “Акварэльныя вобразы Мікалая Мішчанкі”

Мы рады чарговы раз пацешыць вока нашых наведвальнікаў яскравымі мастацкімі працамі. Наконт яскравасці тут гутарка вядзецца не столькі аб фарбах, колькі аб тых вобразах, якія яны раскрываюць, вобразы мясцін блізкіх і далёкіх геаграфічна.

Гэтым разам у нашым музейна-выставачным комплексе (Заслаўе, вул. Рынкавая, 4) адбываецца выстава акварэльных работ мастака **Мікалая Мішчанкі**, які сягнуў сваёй думкай нават у далёкі край каранёвых пачаткаў культуры Усходу – *Кітай*. У жанры краявіду гэтай краіне тут адведзена асобнае месца.

Мікалай Мішчанка з'яўляецца прафесійным мастаком. Творы яго аўтарства захоўваюцца як у дзяржаўных музеях і галерэях, так і ў прыватных калекцыях Беларусі і замежжа, а таксама дэманструюцца на шматлікіх выставах рознага ўзроўню арганізацыі.

Дадзеная выстава дзейнічае з 21 студзеня да 28 лютага. 21-га лютага выдатны мастак-творца Мікалай Мішчанка будзе святкаваць свой *74-ы Дзень нараджэння*. Лепшы спосаб адзначыць свята для творцы – гэта

зрабіць прыемны падарунак аматарам мастацтва, паказаць плён сваёй працы, захапіць сваім натхненнем і аўтарскім бачаннем.



*Да кітайскіх краявідаў або Усходняя тэма на выставе*

Шчыра запрашаем Вас, шаноўныя чытачы, наведаць гэту выставу, каб адкрыць для сябе айчынныя і замежныя краявіды, адлюстраваныя праз прызму мастацтва і асабістага бачання Мікалая Мішчанкі.

**Прывітанне ад калегі**

**Вінцэсь Манько** працаваў у нашым музеі-запаведніку з 1990 па 1995 гг. Вадзіў экскурсіі, дапамагаў млынару (быў яго памочнікам), быў рабочым, вартаўніком, ездзіў у этнаграфічныя экспедыцыі, з’яўляўся загадчыкам этнаграфічнага комплекса “Млын”.

У спадара Вінцэся маецца шмат добрых згадак аб Заслаўі, аб працы ў музеі-запаведніку, найбольш – аб этнаграфічным комплексе “Млын”, на якім яму галоўным чынам выпадала працаваць, для якога ён з сябрамі разабраў і перавёз свіран з в. Міхнічы Пастаўскага раёна, накрыў яго гонтай. Актыўны ўдзел спадар Вінцэсь прыняў і ў яго зборцы на тэрыторыі этнаграфічнага комплекса.

Па кузні спадар Вінцэсь згадвае, што мяхі і фартух каваля шыў уласна **Фёдар Волкаў**, рабіў ён таксама і палаці ў хаце завознікаў. Шыльду, якая віcіць на ўваходзе ў млын, выразаў **Юрась Малаш**.



*Падрыхтоўка да зборкі свірана на этнаграфічным комплексе музея-запаведніка. Злева-направа: Вінцэсь Манько, Фёдар Волкаў і іх сябра Міхаіл*

Найбольшыя ўспаміны спадара Вінцэся звязаны з млыном, бо ён аказваў на ім дапамогу ў якасці памочніка млынара, непасрэдна ўдзельнічаў у працэсе памолу і атрымання крупы. Млынаром у 1990-х гг. быў **Чэмко Міхал Антонавіч**. Таксама спадар Вінцэсь згадвае аб млынары з Заслаўя, які працаваў ранейшым часам (у 1930-я гг.), – **Яне Феліксавічы Астроўскім** (яго партрэт і цяпер вісіць на 3-ім паверсе млына), які дажыў ажно да 1990-х гг. Рухавік электрычны быў на 55 кВт (яго магутнасць ледзве здужвала прывесці ў дзеянне адзін пастаў): пры запуску адбывалася перагрузка электрычнай сеткі – выбівала асвятленне ў суседніх дамах. Парэнчы і лесвіцы на млыне рабіліся нанова і рабіў іх уласна спадар Вінцэсь. Сістэма паяднання валоў (гарызантальнага і вертыкальнага) на 1-м паверсе працавала без падшыпнікаў (на змазцы – аліве), каб жалеза ў зубах шасцярон не перацерла іншае жалеза, устаўляліся спецыяльныя драўляныя зубы (мягчэйшы за жалеза матэрыял). Драўляныя зубы своечасова паліваліся вадой, каб яны не рассохліся і не разламаліся. Крупадзёрка дапамагала атрымліваць крупу (пярлоўку), унутры яе ёсць камень, падобны да паставовага (які ў жорнах), зерне трапляла між цёркай і камянём, абдзіралася на крупу і разам з усім

ссыпалася ўніз – у сіта, дзе крупа аддзялялася ад непатрэбнага. Працавала крупадзёрка аўтаматычна – колькасць абаротаў выстаўлялася адмысловым рычажком (у нас – драўляны або часовы, планавалі паставіць затым металічны, але таго не адбылося) на жалезным коле. Жорнавыя камяні для млына заліваліся ў адмысловую форму ўласна на млыне (на 2-ім паверсе) з дапамогай спецыяльнага раствора, у які дадаваўся тоўчаны крэмень. Кожны завознік быў павінен прывезці на новы жорнавы камень трохі тоўчанага крэменю, а ўзімку – і трохі дроўцаў для ацяплення хаты завознікаў. Жорнавы камень, што не рухаўся (ніжні), зваўся “мёртвым”. Насечка на жорнавых камянях рабілася спецыяльным малаточкам-кляўцом (з пляскатай вузкай дзюбкай, падобны ёсць на кузні), каб зерне пераціралася на муку, а скіраванасць іх ад адтуліны “праменнямі” (выдзяўбанымі даўгімі раўкамі) вонкі да краю была абумоўлена той патрэбай, каб мука пры вярчэнні каменю па інэрцыі высыпалася між камянёў. Кош, па якім зерне трапляла ў пастаў, пры патрэбе прачышчаўся, для чаго яго падчэплівалі жалезным гакам (круком), што вісеў побач, за прыбітае на ім жалезнае “вушка”. Другі пастаў млына, верагодна, быў разабраны яшчэ пасля Вялікай Айчыннай вайны. Камяні з яго размеркаваліся так: першы пакладзены пры ганку млына, другі – стаіць пры сцяне другога паверха. Рычаг ліфтавога механізма зваўся “вагой”; накручаны на ліфтавы механізм металічны тросік вярталі назад, цягнучы яго проста рукамі ўніз (з 1-га паверху). У машынным аддзяленні маецца калодзеж (зараз закладзены), які раней выкарыстоўваўся для ахаладжэння паравога рухавіка. На сцяне млына (на 1-м паверсе) маецца багата запісаў, зробленых алоўкам: тут падлічвалі перавод з фунтовай і пудовай сістэм лічэння вагі, рабілі іншыя запісы, каб не забыцца. Тартак (пільня) сапраўды пры млыне раней існаваў. Прыбудову на паліва (дровы, торф), якая існуе і цяпер, узвялі ў 1990-х гг.

Уласна этнаграфічны комплекс быў абгароджаны жэрдкамі, перамежаванымі слупамі (звыклым вясковым спосабам, двор праглядаўся выдатна), уезд у двор ажыццяўляўся праз браму. “Глухога” плата і “глухой” брамы з дошак, як ёсць зараз, у 1990-х гг. не было. Побач з млыном была “канавязь” для навязвання коней. Цяперашнюю гонту паклалі на млыне ў 1990 г., прывезлі яе з г. Гродна. На завоз у час працы спадара Вінцэся прыязджала шмат людзей, бывала, што прыходзілася заставацца на працы, каб усё скончыць, і да 12-й гадзіны начы. Везлі людзі зерне, хто як мог: хто на электрычцы, хто на вазах. Людзям больш не было куды везці свой ураджай, апрача як сюды, бо ў ваколіцы больш млыноў, такіх каб працавалі, не было.



*Працэс зборкі свірана на этнаграфічным комплексе музея-запаведніка.*
*Злева – Вінцэсь Манько, справа – Юрась Скрыган*

Асноўныя працы па перавозцы свірана на этнаграфічны комплекс былі здзейснены прыкладна ў 1993-1994 гг. Гаспадар будынка, пэўна, быў ветэрынарам, бо на гарышчы пры разборцы трапілася нямала польскамоўнай ветэрынарнай літаратуры. Таксама пры разборцы між бярвён знайшлі польскія злотыя (папяровыя) і агітацыйныя ўлеткі да выбараў у польскі сойм “жыдоўска-ўкраінска беларускага блока”. Сцены свірана былі абклеены польскамоўнымі газетамі даваеннага часу. Адзін з родзічаў гаспадароў будынка жыў у Польшчы і быў навукоўцам. Ён вельмі ўсцешыўся навіной, што будынак будзе забраны пад музей, даслаў планы і выявы, зробленыя ўласнай рукой. Стала вядома, што першапачаткова збудаванне было свіранам, а пасля яго перарабілі пад хату. Пры складванні будынка на тэрыторыі этнаграфічнага комплекса вокны прыбралі, увесь аб’ём быў “глуха” закрыты бярвеннямі. Драўляныя фігуркі ўпрыгажэння на галоўным фасадзе будынка былі ўзноўлены ў наш час, але яны існавалі там і першапачаткова – гэта не фантазія. Калі вялася справа разборкі, спадар Вінцэсь з сябрамі жыў у кабеты, што была гаспадыняй будынка. Яна паказала карціну, дзе быў выяўлены Напалеон на пажары Масквы. Казала, што яна раней вісела ў гэтым будынку, і як хлопцы перавязуць будынак на новае месца, то яна падорыць гэту карціну музею. Але, на жаль, таго не

адбылося, бо хуткім часам тая кабета загінула ў пажары (згарэла ва ўласнай хаце). Дзверы ў свіран захаваліся па гэты час арыгінальныя, у іх раней быў урэзаны замок (адтуліна ад яго захавалася), які адмыкаўся вялікім жалезным ключом, падобным да таго, якім звычайна адмыкаюць і замыкаюць вялікія дзверы касцёлаў.

Па хаце завознікаў Вінцэсь згадвае гэткае. Падлога першасна тут была з гліны. Бізун, што вісіць у сенцах на сцяне, прывезены з экспедыцыі, здзейсненай на тэрыторыю Вілейшчыны. Стары, які аддаў яго для музея, распавёў, што гэты бізун дастаўся яго бацьку ад аўстрыяка (нямецкага салдата), які ў 1915 г. змяняў яго на хлеб. Наконт абраза, што вісіць у белай палове хаты, Вінцэсь упэўнены, што ён паходзіць з Заслаўскага касцёла. Белая фаянсавая талерка, што стаіць тут жа на драўлянай палічцы-судніку, выкарыстоўвалася для таго, каб калоць на ёй цукар, менавіта таму яна такая шчарбатая, на адваротным яе баку – герб Расійскай імперыі, знак фабрыканта Кузняцова. Гэта спадар Вінцэсь памятае таксама яшчэ з часоў экспедыцый.



*Вінцэсь Манько ля пастава млына на этнаграфічным комплексе музея-запаведніка, лета 2022 г.*

У 1990-х гг. муку, змолатую на млыне, вазілі ў пякарню і рабілі з яе свой музейны хлеб (грубага памолу, з вялікімі кавалкамі зярнят), які дужа падабаўся дзецям. Прадавалі яго падчас святаў.

Дадзены матэрыял, узяты з гутарак з Вінцэсем Манько, якія адбываліся летам-восенню 2022 г. Прыемна, што спадар Вінцэсь не

забываецца пра музей-запаведнік і ахвотна дзеліцца сваімі ўспамінамі з яго цяперашнімі супрацоўнікамі. Для нас яны вельмі і вельмі каштоўныя ў рэчышчы разумення гісторыі функцыянавання і складавання этнаграфічнага комплекса, паляпшэння якасці яго прадстаўлення ў межах экскурсійнай працы. Шчыра дзякуем Вам, спадар Вінцэсь, за ўсё, што Вы зрабілі для музея-запаведніка раней і за цяперашні Ваш успамін-падарунак! Будзем рады Вас бачыць у музеі, завітвайце, да гурта, калі ласка!

*гутарку вёў навуковы супрацоўнік*
*музея-запаведніка Ігар Кандратовіч*

### З павагай да зробленага

У гісторыі нашага музея-запаведніка было нямала праектаў, якія ствараліся асобнымі супрацоўнікамі альбо суполкамі аднадумцаў. Далёка не ўсім з іх было суджана ўвасобіцца ў рэчаіснасць – многія з іх засталіся на ўзроўні056 мараў і канцэпцый, але тыя, што ўвасобіліся, сталі асновай нашай установы, базай, якую мы, па магчымасці, імкнемся развіваць, плённа выкарыстоўваем цяпер у працы.



*Юрый Леанідавіч Малаш, Заслаўе, каля 2008-2009 гг.; фота прадставіў А.К. Рак*

Адной з такіх канцэпцый была і канцэпцыя Музея інсітнага (наіўнага) мастацтва ў Заслаўі, падрыхтаваная шмат гадоў таму **Юрыем Леанідавічам Малашом** і рупліва дапрацаваная параўнальна нядаўнім часам *Інэсай Віктараўнай Сабалеўскай*. Але, гэта была не проста канцэпцыя, а больш за яе – адлюстраванне вялікай мары чалавека, да рэалізацыі якой ён імкнуўся і зацікаўліваў гэтым імкненнем іншых, мары, якая цяпер ажыла ў рэчаіснасці.

Юрый Малаш быў навуковым супрацоўнікам нашага музея на працягу многіх гадоў. Калегі згадваюць аб ім так: быў ён чалавекам апантаным пошукамі і творчасцю – адкрываў арыгінальныя работы народных мастакоў-самавукаў і сам ствараў працы ў наіўным стылі, рыхтаваў і публікаваў кнігі, пісаў артыкулы ў розныя выданні, займаўся фотамастацтвам – рабіў аўтарскія фотаздымкі, фотакалажы, фотапаштоўкі, любіў вандраваць і захапляўся прыгажосцю прыроды.

У 2011 г. у зборніку, які быў надрукаваны на аснове матэрыялаў канферэнцыі *“Старажытныя гарады: праблемы даследавання, музеефікацыі, захавання помнікаў і гістарычных тэрыторый”*, у ліку іншых выйшаў і *даклад Ю.Л. Малаша “Інсітнаму музею Беларусі “быць” альбо “не” (с. 78-81)*. Дадзены артыкул мы падаем без змяненняў да ўвагі чытача. Дадаем толькі тое, што зараз пытанне “быць” альбо “не” датычна акрэсленай вышэй праблемы ўжо не стаіць, бо Музей беларускай маляванкі ўжо ёсць і ў хуткім часе будзе адкрыты. **Мара Юрыя Малаша здзейснілася**. На жаль, ён не дажыў да таго, каб пабачыць гэта на ўласныя вочы, але ў атрыманым выніку маецца і вельмі вялікі яго ўнёсак, бо без ідэй і іх абгрунтавання не бывае ўвасабленняў.

Стварыць Музей беларускай маляванкі стала магчыма, дзякуючы фінансавай падтрымцы, якая была атрымана праз **Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва**, а таксама дзякуючы пазабюджэтным сродкам, зробленым нашымі супрацоўнікамі ў выніку правядзення экскурсій, тэатралізаваных праграм і прапановы іншых паслуг для гасцей музея.

## Інсітнаму музею Беларусі “быць” альбо “не”

Гісторыя інсітнага, ці наіўнага, мастацтва мае тысячагадовую гісторыю. Упершыню яна прыцягнула да сябе ўвагу мастакоў і мастацтвазнаўцаў у канцы XIX – пачатку XX стст. Менавіта ў г. Парыжы ў 1885 г. адбылася выстаўка жывапісных твораў француза-самавукі мытніка А. Русо (1844 – 1910), а пазней там у 1899 г., 1901 г. адбыліся выставы прац (скульптуры, жывапісу, разьбы) прадстаўнікоў краін Афрыкі, астравоў

Інданезіі, Паўднёва-Усходняй Азіі, якія здзівілі ўсіх як эстэтычным бачаннем навакольнага свету, так і зусім новымі падыходамі да яго мастацкага адлюстравання. Розныя тэрміны шукалі спецыялісты, каб вызначыць гэтую незвычайную галіну мастацтва: прымітыў ці прымітыўнае (ад лацінскага слова “primitivus” – “першапачатковы, першабытны”), “сучасныя прымітывы”. Пасля таго, як у 1931 г. у г. Парыжы адбылася выстава твораў А. Русо, С. Бамбука, С. Луі (Серафіны), гэтае мастацтва пачалі называць наіўным, а саміх мастакоў – “мастакамі святога сэрца”, бо яны звычайна працавалі на парыжскай плошчы каля сабора Святой Дзевы Марыі. Пазней, у 1966 г., славацкі мастацтвазнавец Ш. Ткач назаве іх творчасць інсітным мастацтвам (г. зн. Прыродным, непасрэдным, альбо наіўным у перакладзе з лацінскай мовы). Акрамя таго, што творчасць мастакоў наіва не мае прафесійнай мастацкай падрыхтоўкі, іх працы вызначаюцца непасрэдным пачуццёвым увасабленнем іх эстэтычнага густу, інстынктыўным адлюстраваннем хвалюючых імгненняў жыцця, дзе значная роля ў мастацкім выяўленні належыць індывідуальнай асобе мастака. У іх мастацкай мове звычайна прысутнічае апавядальнасць, метафарычнасць, падрабязная дэталізацыя разам з імкненнем да абагульнення розных элементаў у адзіную мастацкую прастору. Замілаванасць да прыроды, міфа-паэтычных сюжэтаў, успамінаў аб дзяцінстве (звычайна з сялянскага жыцця), як і высокая духоўнасць мастацкіх вобразаў надае іхнім творам характэрную рысу. Аднак адсутнасць ведаў прафесійнага мастацтва – гэта яшчэ не крытэрый да аднясення таго ці іншага твору да наіўнага мастацтва, ці да прымітыву. Наіўная творчасць грунтуецца на рэалізацыі індывідуальнага пачатку і не мае шчыльных зносін з тымі традыцыямі, якія характэрны для народнага бытавога (дэкаратыўна-прыкладнога) мастацтва. У наіўным мастацтве існуюць свае традыцыі, але яны, па словах прафесара Р.Ф. Шаўры, “не звязаны з калектыўнай формай перадачы адпрацаванага мастацкага кода, а выражаюцца праз дастаткова ўстойлівыя вобразна-сімвалічныя катэгоры падсвядомага, генетычна быццам закладзенага ў чалавеку своеасаблівага мастацкага бачання рэальнага быцця”.

У Расіі цікавасць да прымітыву мела “парыжскі водгалас”, пасля таго як шэраг мастакоў пабываў на пачатку ХХ ст. у Парыжы. Але ж гэта ўвага была абумоўлена ў першую чаргу тым, што яшчэ раней шэраг прафесійных мастакоў, пісьменнікаў выказалі вялікую зацікаўленасць да такога віда народнага мастацтва, як лубок. У 1910 – 1912 гг. адбываюцца выставы аб'яднання мастакоў (Ларыёнаў, Ганчарова, Кандзінскі, Малевіч) пад назвамі “Бубновы валет”, “Асліны хвост”, на якіх побач з мастацкімі творамі былі шырока прадстаўлены лубкі, ці народныя карцінкі, крамныя шыльды. У

гэты час адбываецца “адкрыццё” грузінскага мастака М. Пірасманішвілі (Пірасмані). Узнікае паняцце “прымітывісты” і “неапрымітывісты”. Апошнім называюць прафесійных мастакоў, якія ствараюць свае працы не па класічных канонах прафесійнага мастацтва (так званага акадэмізму), а з адпаведным ухілам у бок народнага мастацтва (наіўныя па першаму ўспрыманню, часцей плоскасныя, але шматперспектыўныя па кампазіцыі і зместу, алегарычныя, стрыманыя ці ўзмоцненыя па каларыце).



Алена Кіш. Дзева на водах. 1930 – 1940



Сяргей Каваль. Мая вёска Якімава Слабада. 2005

Ілюстрацыі да даклада Ю.Л. Малаша са зборніка “Старажытныя гарады: праблемы даследавання, музеефікацыі, захавання помнікаў і гістарычных тэрыторый”; першая выява (зверху-ўніз): дыван Алены Кіш “Дзева на водах”, 1930-1940-я гг.; другая – дыван Сяргея Каваля “Мая вёска Якімава Слабада”, 2005 г.

У 2002 г. на Навуковай радзе ГКМЗ “Заслаўе” была прынята канцэпцыя “Музея інсітнага мастацтва”, якую падрыхтаваў старшы навуковы супрацоўнік Ю.Л. Малаш. Безумоўна, што падмуркам для гэтай канцэпцыі стала калекцыя маляваных дываноў Гісторыка-культурнага

музея-запаведніка “Заслаўе”, якая налічвае сёння каля 200 адзінак *[цяпер – больш за 260 адзінак – рэд.]*. Калекцыя бярэ пачатак з 1988 г., калі ад мастакоў А. Марачкіна, В. Басалыгі былі набыты першыя дываны. Маляваныя дываны існавалі на Беларусі вельмі кароткі гістарычны час (1920 – 1960 гг.) і мелі абмежаваныя рэгіёны свайго бытавання (асабліва Палессе, Мінская і Віцебская вобласці). Але менавіта дываны захавалі традыцыйныя для беларускай культуры арнаменты, тэматычна-сюжэтныя вобразы, якія можна параўноўваць і знайсці на археалагічных культавых рэчах, рукапісных манускрыптах, кафлі, тканых посцілках, ручніках, народных строях і вельмі характэрным для XIX – пач. XX стст. – на размаляваных куфрах, выцінанках. Хочацца адзначыць, што малываныя дываны бытавалі ў гэты час на тэрыторыі Украіны, Расіі, Польшчы, але толькі ў Беларусі яны атрымалі сваё пачэснае месца як у музейных калекцыях, так і ў навукова-экспазіцыйнай дзейнасці.

Неабходнасць стварэння Музея інсітнага (наіўнага) мастацтва тлумачыцца, акрамя наяўнасці калекцыі маляваных дываноў, і адсутнасцю ў Беларусі музея падобнага віда. Ужо некалькі гадоў існуе Музей наіўнага мастацтва г. Масквы, у якім неаднойчы праводзіліся выстаўкі з фондаў музея “Заслаўе”, у першую чаргу маляваных дываноў, і якія неаднойчы атрымлівалі розныя дыпломы, узнагароды. У 2004 г. у гэтым музеі праводзіўся Першы фестываль наіўнага мастацтва, на якім было прадстаўлена звыш 280 твораў наіўных мастакоў, сярод якіх мастацкім айсбергам узвышаўся дыван Алены Кіш ”У райскім садзе”, які прыцягваў да сябе шматлікіх наведвальнікаў.

Сярод еўрапейскіх музеяў наіўнага мастацтва трэба адзначыць буйнейшыя, як Musee International d'art Naif у Францыі, Museum Charlotte Zander у Германіі, Museum naïvne umestnostey u Ygodzina у Сербіі, Galerie d'art Naif у Польшчы, з якімі музею-запаведніку “Заслаўе”, магчыма, давядзецца шукаць шляхі для кантактаў. Заўважу толькі самае неабходнае, што можа прынесці такая сувязь з еўрапейскімі, як і лацінаамерыканскімі, канадскімі, амерыканскімі ды іншымі музеямі наіва:

– атрыманне даведачнай, асветніцкай і навуковай інфармацыі аб гісторыі і сучасным стане развіцця наіўнага мастацтва ў свеце;

– атрыманне такой інфармацыі, безумоўна, будзе спрыяць добраму прафесійнаму ўзроўню як пад час стварэння Музея інсітнага мастацтва Беларусі, так і правядзення ў далейшым выставак, пленэраў з удзелам мастакоў наіва, выдання буклетаў, адкрыццё сайта музея ў інтэрнэце;

– інфармацыйны выхад беларускага маляванага дывана, як і творчасці беларускіх мастакоў наіва, на сусветную прастору Art-Naive;

– правядзенне сумесных выставак, біенале, канферэнцый, іншых мастацкіх праектаў.

Канцэпцыя Музея інсітнага мастацтва Беларусі прадугледжвае будаўніцтва памяшкання музея ў г. Заслаўе. У экспазіцыйных залах будуць экспанавацца маляваныя дываны Я. Драздовіча (калекцыя налічвае 30 адзінак; *[зараз – каля 40 – рэд.]*), працы А. Кіш (11 твораў), дываны невядомых аўтараў. Маляваныя дываны з калекцыі ГКМЗ “Заслаўе” неаднойчы экспанаваліся на выстаўках у музеях, школах гг. Заслаўя, Мінска, Полацка, Слуцка, заўсёды выклікаючы вялікую цікавасць у наведвальнікаў. Значнаму паляпшэнню ведаў пра гісторыю стварэння калекцыі маляваных дываноў паспрыяла выданне ў 2005 г. альбома-каталога “Беларускія маляваныя дываны з фондаў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе”. Гэта выданне стала магчымым дзякуючы фінансавай падтрымцы Заслаўскага гарвыканкама. Зараз выдавецтвам “Літаратура і мастацтва” рыхтуецца да выдання кніга Юрася Малаша “Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі”, якая фінансуецца аблвыканкамам Мінскай вобласці і Заслаўскім гарвыканкамам. Безумоўна, гэта сведчыць аб той значнай увазе, якая надаецца наіўнаму мастацтву кіраўніцтвам г. Заслаўе і Упраўленнем культуры Мінскай вобласці.

Акрамя маляваных дываноў, як і маляваных карцінак на кардоне, роспісу па шклу з фондаў ГКМЗ “Заслаўе”, у экспазіцыі Музея інсітнага мастацтва прадугледжана галерэя для сучасных мастакоў наіва, творы якіх можна не толькі паглядзець, але і набыць турыстам.

Адсутнасць фінансавых сродкаў не дазваляе сёння ДУ ГКМЗ “Заслаўе” набываць працы сучасных наіўных мастакоў Беларусі, але пэўныя шляхі ў гэтым накірунку ўжо зроблены. У фондах ГКМЗ “Заслаўе” захоўваюцца творы такіх сучасных мастакоў наіва, як Сяргей Каваль, Яніна Барычэўская, Юрась Малаш. К завяршэнню будаўніцтва Музея інсітнага мастацтва неабходна, каб была прадугледжана і фінансавая палітыка музея, ад якой будуць вельмі залежаць фондазакупачная тактыка і стратэгія. Але ж, акрамя гэтага, трэба вызначыць галоўныя накірункі як для навукова-даследчай, так, безумоўна, і творчай працы з мастакамі наіва, спецыялістамі ў гэтай галіне. Заўважу, што мастакі – гэта вельмі чуллівыя, успрымальныя душы, якія лёгка параніць, пакрыўдзіць, але вельмі цяжка пачуць, пра што яны разважаюць.

Толькі пры выкананні гэтых галоўных напрамкаў пры стварэнні Музея інсітнага мастацтва Беларусі магчыма не толькі чакаць, але і атрымаць рэальныя вынікі музейнай працы, якая паспрыяе павелічэнню культурнага і мастацкага аўтарытэту не толькі наіўнага, але і традыцыйнага

нацыянальнага беларускага мастацтва ў свеце. Магчыма, тады асабіста мне і тым, каго лёс накіраваў у старажытнае Заслаўе, не прыйдзецца задаваць пытанне: "быць альбо не..." Музею інсітнага мастацтва ў Беларусі.

*старшы навуковы супрацоўнік*
*аддзела экспазіцыі Дзяржаўнага*
*гісторыка-культурнага музея-*
*запаведніка "Заслаўе" Ю.Л. Малаш*

## ***Навуковая праца***

### Заслаўе ў беларускай культуры

Значнасць пэўнай мясціны ў рэчышчы працэса развіцця культуры вызначаецца на аснове розных крытэрыяў. У ліку найбольш заўважных з шэрагу іх ёсць фактар нараджэння, дзейнасці або нават проста часовага пражывання ў пэўных мясцовасцях (гарадах, мястэчках, вёсках) вядомых гістарычных дзеячаў, асоб, якія пакінулі заўважны след у гісторыі.

Заслаўе, у гэтым аспекце, мае кім ганарыцца. Постаці асоб, што стваралі не толькі айчынную, але і сусветную гісторыю, пакінулі тут свой адметны, запамінальны "след". Сярод іх – дзеячы рэлігіі і асветы, ваеннай справы, пісьменнікі, дзяржаўныя дзеячы і іншыя. Звернемся да згадкі пра адну з такіх асоб, каб яскравей усвядоміць значнасць Заслаўя ў беларускай гісторыі і культуры.

Быў час, калі *Заслаўе было літаральна вялікакняскім горадам*, бо належала непасрэднаму прадстаўніку рода вялікіх князёў літоўскіх – **Яўнуту**, які быў сынам вялікага князя **Гедзіміна**. Звернемся да асобы Яўнута і тых падзей, у выніку якіх адбылася падобнага роду трансфармацыя.

Гедзімін вызначыў сабе спадкаемцам Яўнута, які быў малодшым сынам. Пасля смерці бацькі (ў 1341 г.) ён становіцца вялікім князем літоўскім. Аднак, з гэтым былі нязгодныя яго старэйшыя браты – **Альгерд і Кейстут**, якія ў 1345 г. адабралі ў яго ўладу.

Яўнут быў вымушаны ратавацца ўцёкамі, спрабаваў атрымаць падтрымку вялікага князя маскоўскага, але той яму сваё войска не даў. Браты ж, Альгерд і Кейстут, паклікалі Яўнута мірыцца і прапанавалі яму ў якасці "кармлення" (ўласнасці на ўтрыманне сябе і свайго княскага двара) Заслаўе і яго ваколіцы. Яўнут пагадзіўся, памірыўся з братамі і стаў жыць у Заслаўі, якое стала яго ўласнасцю і рэзідэнцыяй.

Спадчыннікі Яўнута Гедзімінавіча сталі звацца **князямі Заслаўскімі** і валодалі Заслаўем і яго ваколіцамі аж да той пары, як апошняя з роду князёў Заслаўскіх – **Ганна Фёдараўна** стала жонкай Яна **Юр'евіча Глябовіча**, пасля чаго Заслаўе перайшло ва ўласнасць Глябовічаў [1, с. 61, 65, 78, 80; 2, s. 442].




*Яўнут Гедзімінавіч. Работа гравера Аляксандра Тарасевіча, XVII ст.*

Такім чынам, калісьці Заслаўе было *сапраўднай рэзідэнцыяй аднаго з прадстаўнікоў роду вялікіх князёў літоўскіх*. Гэтым можа пахваліцца далёка не кожны населены пункт нашай краіны, у чым зноўку выяўляецца высокая каштоўнасць Заслаўя як гістарычнай і культурнай спадчыны Беларусі.

*Літаратура:*

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Заслаўя. – Мн. : БЕЛТА, 2000. – 464 с.: іл.

2. Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich / wydany pod redakcyą Filipa Sulimierskiego, Bronisława Chlebowskiego, Władysława Walewskiego. T. 14 : [Wor – Żyż]. – 1895. – 930, 8 c.

## Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст. Пасляслоўе

*Выставачны праект “Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.” скончаны, але хацелася б сказаць некалькі слоў аб удзеле ў ім Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці*

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці на сённяшні дзень з'яўляецца найбуйнейшым рэгіянальным архівам у нашай краіне. Сталічны статус горада Мінска і цэнтральнае становішча Мінскага рэгіёну прадвызначаюць значнасць дадзенага архіўнага комплексу для гістарычнай навукі нашай дзяржавы.

На пачатак 2022 г. на захоўванні ў архіве знаходзілася 5940 фондаў, 1 466 813 справы, па колькасці адзінак захоўвання (спраў) архіў з'яўляецца найбуйнейшым у Рэспубліцы Беларусь.




*Пакой захоўвання дакументаў архіва*

Гісторыя архіва Мінскай вобласці пачынаецца з 5 ліпеня 1938 г. — даты прыняцця пастановы Прэзідыума ЦВК БССР "Аб рэарганізацыі архіўных органаў у сувязі з утварэннем абласцей у БССР". Але ў Мінскага абласнога архіва былі два папярэднікі — Мінскі гістарычны архіў, які пачаў фарміравацца ў 1922 г. на аснове дарэвалюцыйных дакументаў устаноў былой Мінскай губерні, і архіў Мінскай акругі, якая існавала ў 1927–1930 гг. У 1930 г. у сувязі з ліквідацыяй Акруговага адміністрацыйнага дзялення, Мінскі акруговы архіў быў расфарміраваны, а яго дакументы падзеленыя паміж Мінскім гістарычным архівам і Цэнтральным архівам Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР. Мінскі гістарычны архіў пад рознымі назвамі праіснаваў аж да ліпеня 1938 г., калі на яго базе быў створаны Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці.

Па стане на 1 ліпеня 1938 г. у Дзяржархіве на захоўванні знаходзілася 1078 фондаў, 1 003 132 справы, з іх каля 400 тыс. спраў савецкага перыяду, а таксама бібліятэка з больш чым 55 000 тамоў. У адпаведнасці з пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 27 верасня 1938 г. цэнтральнае архіўнае ўпраўленне БССР і падначаленыя яму архівы былі перададзены ў распараджэнне НКУС БССР. З 23 красавіка 1939 г. на падставе загада НКУС СССР абласныя архіўныя ўпраўленні былі рэарганізаваны ў архіўныя аддзелы ўпраўленняў НКУС абласцей. Дзяржархіў Мінскай вобласці быў падпарадкаваны архіўнаму аддзелу УНКУС па Мінскай вобласці. У 1941 г. у Дзяржархіве Мінскай вобласці налічваліся 22 супрацоўнікі, з іх 9 навуковых і архіўна-тэхнічных. Дзяржархіў у пачатку нямецка-фашысцкай акупацыі (чэрвень 1941 г.) не быў эвакуіраваны, як і большасць дзяржаўных архіваў БССР. Неўзабаве пасля пачатку акупацыі будынак архіва па вул. Бакуніна, д. 3 у Мінску быў *перададзены* вернікам пад царкву. Дакументы савецкага перыяду, якія захоўваліся ў гэтым будынку, былі выкінутыя на вуліцу, дзе знаходзіліся каля месяца, пасля чаго былі перанесены ў падвальнае памяшканне. Гэты дакументальны комплекс (у дакументах акупацыйнага перыяду ён называўся “чырвоным”, г.зн. савецкім архівам) у гады акупацыі некалькі разоў перавозіўся з месца на месца: у бібліятэку імя Леніна, у падвал бібліятэкі імя Пушкіна па вул. Кастрычніцкай, д. 6, на гарышча будынка па вул. Астроўскага, д. 31. У выніку значная колькасць спраў была страчана.

Комплекс дакументаў дарэвалюцыйнага перыяду Дзяржархіва за часамі акупацыі заставаўся ў будынку па вул. Бакуніна, д. 42. Яго наведвалі экскурсійныя групы нямецкіх афіцэраў, якія знаёміліся з архіўнымі матэрыяламі. Перыядычна з архіва па ўказанні нямецкіх акупацыйных уладаў канфіскоўваліся асобныя дакументы, газеты, архіўныя справы і цэлыя фонды, лёс якіх застаўся невядомы. Увесну 1944 г. акупацыйныя ўлады пачалі падрыхтоўку да вывазу з Мінска найбольш каштоўных архіўных дакументаў. Супрацоўнікамі Дзяржархіва па ўказанні Генеральнага камісарыята Беларусі быў падрыхтаваны спіс фондаў архіва, якія падлягаюць вывазу. З 578 улічаных на той момант фондаў архіва для адпраўкі было выяўлена 90. Для іх перавозкі, па ацэнцы архівістаў, патрабавалася 26 чыгуначных вагонаў.

Сярод запланаваных да адпраўкі былі фонды канцылярыі мінскага губернатара, Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу, Мінскай духоўнай кансісторыі, архіў Радзівілаў і інш. Частка дарэвалюцыйных фондаў Дзяржархіва ў чэрвені 1944 г. была вывезеная пад кіраўніцтвам Вацлава Студніцкага ў горад Тропаў Судэцкай вобласці (Сучасны Опава ў Чэхіі)

разам з усім Радзівілаўскім архівам. Там пражывалі прадстаўнікі роду Радзівілаў, якія і прынялі на захоўванне гэтыя дакументы. Усяго акупанты вывезлі з Дзяржархіву 6 архіўных фондаў (каля 10 тыс. спраў XIX ст., не лічачы Радзівілаўскага архіва). У цяжкіх умовах акупацыі супрацоўнікі Дзяржархіва ў меру сваіх магчымасцяў імкнуліся захаваць дакументы для наступных пакаленняў. Звыш за 500 тыс. спраў дарэвалюцыйнага перыяду і каля 300 тыс. спраў 1920–1930-х гг. былі выратаваны і ў цяперашні час знаходзяцца ў архівасховішчах Дзяржархіва Мінскай вобласці, Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. У ліпені 1944 г. была адноўлена работа дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў захаваным будынку па вул. Бакуніна, д. 4.

У 1944 г. у Дзяржархіве ўпершыню было ўведзена структурнае дзяленне на аддзелы (штат 23 чалавекі).

У 1958 г. Мінскі аблвыканкам абвясціў аб рашэнні будаваць новы будынак для архіва па вул. Даўгабродскай, 32 (цяпер – вул. Казлова, 26). У 1963 г. было скончана будаўніцтва і Дзяржархіў пераехаў у новы будынак.

Гісторыя дакументаў, фондаў і кадравага складу Мінскага абласнога архіва сыходзіць з XIX стагоддзя.

Калі больш дэталёва разглядаць склад фондаў*, то можна выявіць, што* Дзяржаўны комплекс уключае ў сябе дакументы органаў дзяржаўнай улады і дзяржаўнага кіравання, дзяржаўнага і народнага кантролю, органаў юстыцыі, унутраных спраў, пракурорскага нагляду, адвакатуры, натарыята, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый, органаў па працы, занятасці, сацыяльнаму забеспячэнню, планавых камісій, фінансавых упраўленняў і аддзелаў, падатковых інспекцый, статыстычных упраўленняў, установаў і прадпрыемстваў па будаўніцтве, кааперацыі, прамысловасці, транспарце, сувязі, сельскай і лясной гаспадарцы, меліярацыі, гандлі, грамадскаму харчаванню, нарыхтоўках, камунальнай гаспадарцы, адукацыі, архіўных установаў, установаў і арганізацый сродкаў масавай інфармацыі, выдавецкай справы, арганізацый культуры і мастацтва, органаў аховы здароўя, установаў па фізкультуры і спорце, дзяржаўных органаў па справах рэлігійных канфесій за 1917–2018 гг. Партыйны комплекс — гэта дакументы аб дзейнасці Камуністычнай партыі Беларусі і Ленінскага Камуністычнага саюза моладзі Беларусі за 1917–1991 гг.

Фонды ўстаноў перыядаў нямецкай (люты-снежань 1918 г.) і польскай (ліпень 1919 г. – ліпень 1920 г.) акупацыі.

Дакументы перыяду нямецка-фашысцкай акупацыі (чэрвень 1941 г. – ліпень 1944 г.) прадстаўлены фондамі ўстаноў, арганізацый і

прадпрыемстваў, якія дзейнічалі ў той час на акупаванай тэрыторыі Мінскай вобласці, і адлюстроўваюць палітыку нямецкіх уладаў.

У архіве захоўваецца шэраг калекцый, сфарміраваных з дакументаў малааб'ёмных фондаў мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, прадпрыемстваў і ўстаноў недзяржаўнай формы ўласнасці.

Пра захоўванне архіву Мінскай вобласці клапоцяцца супрацоўнікі аддзелаў забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў, справаводства і фарміравання Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь, выкарыстання і публікацыі дакументаў, інфармацыйна-пошукавых сістэм і аўтаматызаваных архіўных тэхналогій, лічбавання і спецыяльнай апрацоўкі дакументаў, па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

Тэрытарыяльны ахоп дакументаў даволі шырокі. Гэта скасаваная Мінская губерня, скасаваныя Заслаўскі, Рудзенскі раёны. Матэрыялы горада Мінск, а таксама Бярэзінскі, Дзяржынскі, Клецкі, Мінскі, Нясвіжскі, Пухавіцкі, Смалявіцкі, Стаўбцоўскі, Уздзенскі, Чэрвеньскі раёны Мінскай вобласці.

У студзені 2023 г. завершыў сваю работу выставачны праект "Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.". Экспазіцыйны праект асвяціў асобныя старонкі жыцця г. Заслаўя ў розныя часы існавання СССР. Перад усім акцэнт быў зроблены на гісторыі Заслаўскай воласці і Заслаўскага раёна ў савецкі перыяд (да 1959 уключна). Каб паўнавартасна асвяціць гэты час у музейнай экспазіцыі куратары выставы звярнуліся па дапамагу ў галоўную архіўную установу Мінскай вобласці.

Былі перагледжаны некаторыя архіўныя справы, адабраны па азначаным перыядзе, і сярод шматлікіх архіўных дакументаў выбраны найбольш неабходныя матэрыялы для экспанавання. Супрацоўніцтва з Мінскім абласным архівам дало магчымасць наведвальнікам музея-запаведніка пазнаёміцца з гісторыяй Заслаўскага раёна не толькі праз музейныя прадметы і вобразы, зафіксаваныя на фотаздымках, але і праз архіўныя дакументы — найкаштоўныя гістарычныя крыніцы.

На выставе былі прадстаўлены дакументы Заслаўскага РК КПБ. Сярод дакументаў фонду 185-П "Заславский районный комитет Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии, м. (с 27.09.1938 – г.п.) Заславль Заславского района Минского округа, с 26.07.1930 — Заславского района, с 20.02.1938 — Заславского района Минской области" прадстаўленыя наступныя справы: спр. 6 "Протокол заседания I съезда Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов Заславского района от 07.12.1924 г."; спр. 10 "Протоколы заседаний Заславской волостной ячейки КП(б)Б план работы района КП(б)Б, сведения о социально-экономическом

положении района и о работе сельскохозяйственных и молочных товариществ, отчет о работе бюро ячеек КП(б)Б 15-го пограничного отряда”; спр. 50 “Циркуляр ЦК КП(б)Б от 30.04.1926 «Методы антисионистской агитации и пропаганды”, протоколы заседаний Еврейского бюро Минского окружкома КП(б)Б, списки граждан еврейской национальности Заславского района по состоянию на 07.04.1927 г.”; спр. 105 “Переписка с управлением 15-го Заславского пограничного отряда о социально-экономическом и политическом положении Заславского района”; спр. 167 “Постановления и выписки из протоколов заседаний Заславского райкома и бюро райкома КП(б)Б, переписка с ЦК КП(б)Б, Засласвским райотделом НКВД БССР и управлением 15-го Заславского пограничного отряда о грубых нарушениях советского законодательства в учреждениях и колхозах района и о выселении неблагонадежных граждан из пограничной зоны”.




*Архіўныя дакументы, дэманстраваныя ў музеі-запаведніку*

Асаблівую цікавасць выклікалі дакументы акупацыйнага перыяду з фонду 1039 “Коллекция малообъёмных фондов учреждений оккупационного периода 1941–1944 гг.”. У адной падшыўцы згрупіраваны дакументы “Заславская районная управа. Списки работников районной и волостной управ, предприятий и учреждений района за 1942 г.”, у іншай — “Заславская районная управа. Заявления граждан об оказании помощи в приобретении и постройке жилых домов, акты осмотра и оценки строений, справки о составе семьи”. Склад дакументаў фонда разнастайны — гэта загады, інструкцыі, распараджэнні, пратаколы, справаздачы, штатныя расклады, перапіска, рапарты і данясенні, заявы, ведамасці, спіскі, анкеты, журналы ўліку і інш.



*Частка экспазіцыі сумеснага выставачнага праекта ў музеі-запаведніку з архіўнымі дакументам*

Такім чынам, сумесны выставачны праект уяўляў з сябе living рознабаковае даследаванне-аповед пра гісторыю Заслаўя і Заслаўскага раёна за перыяд з 1920-ых па 1959-ы гг. Такая супраца музея-запаведніка з архіўнымі ўстановамі яшчэ раз — і ўжо не ўпершыню, — пацвердзіла выдатны вынік сумесных намаганняў ў вяртанні да мінулага і практык аповеду пра яго.

Выказваем словы падзякі супрацоўнікам Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, якія прынялі ўдзел у стварэнні выставы, за іх шчырую асабістую зацікаўленасць ў даследаванні і захаванні архіўнай спадчыны Мінскай вобласці, ў тым ліку — Заслаўя.

*Выкарыстаная літаратура*


Государственный архив Минской области: путеводитель: (1917–2013 гг.) / Главное управление юстиции Минского облисполкома. — Минск : Колорград, 2016. — 701, [1] с.

Фонды : Характеристика фондов (по состоянию на 01.01.2022) [Электронный ресурс] / ГАМО. — Режим доступа: https://www.gamn.by/be/fondy.html. — Дата доступа: 24.01.2023.



*Матэрыял падрыхтаваны Ксеніяй Сямашка,*
***ст. навуковым супрацоўнікам музея-запаведніка***


## О первом директоре Заславской средней школы

Во время немецкой оккупации работа советских школ на территории Беларуси была прекращена захватчиками. Полноценно (без учёта школ в

партизанских зонах) восстановить работу советских школ в Беларуси стало возможно летом-осенью 1944 г., после освобождения территории БССР Красной Армией.

Процесс восстановления централизованного обучения детей в школах происходил в тяжёлых условиях. Не хватало учителей, помещений, оборудования, учебников, писчей бумаги, канцелярских принадлежностей и прочего. Однако, данный процесс вёлся повсеместно (по всей территории БССР), так как чрезвычайно важно было взяться за обучение и воспитание подрастающего поколения. Огромная ответственность по непосредственной организации обучения детей лежала на директорах вновь созданных школ.



*Ю.Л. Кірылоўскі ў Чырвонай Арміі, 1939 г.*

Вёлся процесс восстановления школьного обучения и в Заславле. Здесь 1-го сентября 1944 г. Заславская средняя школа приняла на учёбу младших школьников. Для старших школьников учебный год начался на месяц позже – 1 октября 1944 г. Первым директором вновь восстановленной Заславской СШ был назначен **Юрий Львович Кирилловский**. Во многом, именно благодаря его стараниям и энтузиазму, а также благодаря помощи других педагогов и иных небезразличных людей, удалось своевременно открыть обучение для детей Заславля и его окрестностей.

Обратимся к биографии Юрия Львовича. Родом он был из г. Москва (1921 г.р.). *Во время Великой Отечественной войны (с 1942 по 1944 гг.)*

*вёл партизанскую борьбу против оккупантов в составе бригады “Штурмовая”, являлся начальником разведки отряда “За Отечество” и командиром диверсионно-подрывной группы.*


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
БССР
ПАСВЕДЧАННЕ № 053660
Кірылоўскі
Юры Львовіч
сапраўды ўдзельнічаў у партызанскім руху на Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны з 23 верасня 1942 г.
па 15 ліпеня 1944 г. у якасці
начальніка разведкі, атрада „За Айчыну", брыгады „Штурмавая"
Старшыня выканкома
Кастрычніцкага раённага Савета
дэпутатаў працоўных

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!
БССР
УДОСТОВЕРЕНИЕ № 053660
Кирилловский
Юрий Львович
действительно участвовал в партизанском движении в Белоруссии в период Великой Отечественной войны с 23 сентября 1942 г.
по 15 июля 1944 г. в качестве
начальника разведки, отряда „За Отечество", бригады „Штурмовая"
Председатель исполкома
Октябрьского районного Совета
депутатов трудящихся
М. П. «3» июня 1971 г.

*Пасведчанне партызана Вялікай Айчыннай вайны Ю.Л. Кірылоўскага*

Получил тяжёлое ранение левой ноги, в результате чего долго страдал хромотой и не мог ходить пешком на большие расстояния. Из-за данной проблемы Юрию Львовичу пришлось освоить верховую езду на лошади. *Лошадь, имевшуюся в его личном распоряжении, Юрий Львович добровольно передал для нужд Красной Армии, продолжавшей борьбу с немцами на Западе.*

После расформирования партизанского отряда Юрий Львович по заданию Белорусского штаба партизанского движения (БШПД) действовал некоторое время в составе истребительных отрядов. *За борьбу с немецкими захватчиками Ю.Л. Кирилловский был награждён орденом Отечественной войны, орденом Красной Звезды, а также медалью “Партизану Отечественной войны”. Командование партизанской бригады “Штурмовая” также ходатайствовало о представлении Юрия Львовича к званию “Герой Советского Союза”, однако это ходатайство не было удовлетворено.* За боевые действия в составе бригады “Штурмовая” ему было присвоено звание лейтенанта запаса.

*Юрий Львович рвался на фронт, хотел продолжить борьбу против немцев в рядах Красной Армии, однако ему в данной просьбе было*

*отказано, а взамен этого была поставлена задача стать директором средней школы в Заславле и восстановить здесь процесс обучения детей.*

Во второй половине сентября 1944 г. Юрий Львович находился на кратковременных курсах в г. Минске. Надолго на учёбу его отпустить не могли: имелся большой недостаток в кадрах, *он лично вёл физику, химию и черчение, а также временно геометрию и историю в 8 классе*. Также Юрий Львович имел и общественную нагрузку: в порядке партийной работы читал лекции по истории Отечества на курсах советско-партийного актива.

Организовав школьную работу в Заславле, Юрий Львович Кирилловский *в апреле 1945 г. вернулся домой в Москву*, где затем восстановился на 1-ом курсе Московского Высшего технического училища (МВТУ) им. Баумана. Затем стал заведующим лабораторией МВТУ им. Баумана, доцентом, старшим научным сотрудником Центрального научно-исследовательского института автоматики и гидравлики (ЦНИИАГ).

У Юрия Львовича есть два внука: Кирилловский Павел Алексеевич и Кирилловский Пётр Алексеевич, одна внучка – Залесова Юлия Кирилловна. Теперь есть и два правнука: Всеволод и Лев Павловичи Кирилловские. Живут в г. Москва.

Информация, отражённая выше, стала известна нам благодаря родственникам Юрия Львовича Кирилловского, проживающим в г. Москва, а непосредственно – благодаря **Юлии Кирилловне Залесовой**, выславшей нам в электронном виде различные оригинальные исторические материалы о нём (копии писем, удостоверения партизана и другое), за что мы искренне благодарны.

Таким образом, “копилка” исторических материалов нашего музея-заповедника была очередной раз пополнена поистине оригинальными и ценными материалами по периоду, который нами ещё далеко не полностью изучен. Работу в данном направлении мы продолжим и в дальнейшем.

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.